# РАЗДЗЕЛ VI

# МЕДЫЯЛІНГВІСТЫКА: СУЧАСНАЯ ПАРАДЫГМА НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ І РЭДАКТАРСКІ ВОПЫТ

## ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ ЛІЧЭБНІКА Ў КАНТЭКСЦЕ

*В. Д. Бардзіян*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 2200004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*bordiyan.Olga@mail.ru*

Прывабнай асаблівасцю любога тэксту з’яўляецца выкарыстанне дакладных канструкцый з мэтай выканання функцыі паведамлення. У гэтых адносінах багатым інфармацыйным зместам валодае лічэбнік, які ў спалучэнні з іншымі часцінамі мовы стварае дакументальнасць перадаваемых падзей у строгай аб’ектыўнасці.

***Ключавыя словы:*** лічэбнік; назоўнік; колькасна-іменнае спалучэнне; член сказа; тэкст.

## FUNCTIONALITE OF THE NUMERAL IN KONTEXT

*V. D. Bardziyan*

*Belarussian State Univercity,*
*9, Kalvariyskaya Str., 2200004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. D. Bardziyan (bordiyan.Olga@mail.ru)*

An appealing characteristic of any is the ussage of exact constructions with a view to report function accomplishment. Regarding this, numeral holds the richest informational content. In combination with other word classes it creates actuality of transmittable events in strict objectivity.

***Keywords:*** numeral; noun; quantitatively-nominal combination; limb; text.

Лік – граматычная катэгорыя, у аснове якой ляжыць супастаўленне аднаго і не аднаго. Гэтая істотная рыса дае магчымасць пры пабудове тэксту шырока выкарыстоўваць такую часціну мовы, як лічэбнік. Адметнай сінтаксічнай асаблівасцю з’яўляецца і тое, што лічэбнік у кантэксце можа спалучацца толькі з назоўнікамі, а таксама разам з імі ўтвараць колькасна-іменныя спалучэнні, якія выступаюць як адзін член сказа і могуць быць дзейнікам: «*Першы блін* не атрымаўся камяком – вынікам нашага ўдзелу сталі бронзавыя медалі» (Звязда, 27.08.2019); «На спецыялізаваным сайце Брэста сабраны *сотні аб’яў* аб здачы кватэр» (Тамсама).

Цікавым падаецца і тое, што ў ролі няпэўна-колькасных лічэбнікаў могуць выступаць асобныя назоўнікі, прыслоўі, займеннікі, якія ў сказе набываюць колькаснае значэнне: «Акрамя яго ў Мінску будзе *шмат* вядомых гульцоў – *шмат* азіятаў і топгульцы…» (Тамсама). Такія словы хоць і выражаюць колькасныя паняцці, але абазначаюць недакладную, неакрэсленую колькасць і не маюць значэння ліку.

Пры дапамозе няпэўна-колькасных лічэбнікаў выражаецца таксама значэнне прыблізнасці: «Ён здольны перасякаць адлегласці ў *некалькі* кіламетраў…» (Тамсама), што падкрэслівае выразнасць таго факта, які апісвае аўтар. Але ў сінтаксічных канструкцыях, дзе неабходны эфект адпаведнасці, выкарыстоўваюцца няпэўна-колькасныя словы з часціцай «ж»: «Не трэба, каб яны *пяць* ці *шэсць* гадзін працавалі ў школе і *столькі ж* дома» (Тамсама).

Калі гаварыць пра пэўна-колькасныя лічэбнікі, то можна адзначыць, што выклікае цікавасць слова «*адзін*». У лічбавым радзе яно выконвае ролю лічэбніка і захоўвае гэтую функцыю толькі ў спалучэннях з множналікавымі назоўнікамі, а таксама можа набываць у сказе функцыю іншых часцін мовы, што стварае ў канве тэксту шырокую палітру пэўнай сацыяльнай ацэначнасці: «Такіх, як тут, няма ні ў *адным* райцэнтры і нават у Магілёве…» (у ролі няпэўнага займенніка); «…неразлучнікі для жаніха з нявестай, звязаныя *адной* доўгай рукой…»; «…*адну* базавую велічыню за рамесніцкую дзейнасць замест падаткаў» (у ролі часціцы «толькі») (Звязда, 23.08.2019). Часта гэты лічэбнік можа набываць прадметнае значэнне і выконваць у сказе функцыю назоўніка – субстантывацца: «*Адзін* за ўсіх, і усе – за *аднаго*» (Звязда, 27.08.2019).

Часцей у тэкстах СМІ для выражэння ліку сустракаецца сінонім гэтай адзінкі назоўнік «*раз*» у спалучэнні з колькаснымі лічэбнікамі:

«…пастаўкі мяса ў Кітай ужо ўзраслі ў 38 *разоў…*». У такіх выпадках і гэты назоўнік выконвае функцыю лічэбніка. Нямала выкарыстоўваецца і канструкцый, дзе назоўнік «*раз*» спалучаецца са словамі «больш», «менш», якія маюць значэнне параўнання: «…накіравалі ў іншыя краіны СНД і прадалі ў *два разы больш*, чым летась» (Тамсама).

Лічэбнік можа знаходзіцца ў сказе пасля назоўніка, і тады праяўляецца не дакладная, а прыблізная колькасць, што надае тэксту большую выразнасць: «Жадаючых набралася чалавек дваццаць» (Звязда, 11.09.2019).

Прыблізная колькасць у кантэксце таксама можа выражацца спалучэннем слоў «каля», «больш за (як)» і інш.: «…адкрыта *каля 900* укладных рахункаў на суму *каля 3 мільёнаў 500 тысяч* рублёў…» (Звязда, 27.08.2019). Што характэрна, падобныя канструкцыі ў колькасных адносінах, калі параўнаць спалучэнні гэтай часціны мовы з іншымі, пераважаюць у тэкстах СМІ.

Такая адметнасць, што лексічныя і сінтаксічныя адзінкі, якія маюць лічбавае значэнне, але граматычна не адносяцца да лічэбнікаў, дазваляе вытворцу тэксту шырока выкарыстоўваць іх з рознымі мэтавымі нагрузкамі: «…*першы раз* трэба было пераадолець 3,5 км, а ў найбліжэйшы ўжо плануецца *каля 6 км.* На *ўсіх* лакацыях ёсць *некалькі* кантрольных пунктаў…» (Тамсама).

«Да колькасных навукоўцы адносяць і лічэбнікі *“паўтара”, “паўтараста”*, якія ў сучаснай мове з'яўляюцца астаткамі некалі існаваўшых больш поўных радоў (параўнайце ў сучасных гаворках: *паўтраця,* г. зн. *два з паловай; паўчварта,* г. зн. тры *з паловай* і г. д., а таксама ў старых летапісах : *полтретьяста, полчетвертаста* і інш. » [1, с. 316]. Адметнасцю выкарыстання гэтых лічэбнікаў з'яўляецца тое, што пры пабудове сінтаксічных канструкцый неабходна ўлічваць род назоўнікаў, з якімі яны спалучаюцца: граматычныя формы пэўна-колькасных лічэбнікаў *паўтараста і паўтара* спалучаюцца толькі з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду: «Ужо больш за *паўтара* стагоддзя (прынамсі з часоў Дуніна-Марцінкевіча) своеасаблівы касцяк беларускай літаратуры складаюць найбольш таленавітыя і самабытныя творцы…» (Літаратура і мастацтва, 28.08.2019).

Лічэбнік жа *паўтары* граматычна здольны ўтвараць канструкцыі толькі з назоўнікамі жаночага роду: «І нядзіўна, што на першы эксперыментальны дом у Смалявічах, а дакладней на 192 кватэры ў гэтым доме, прэтэндуе *паўтары* тысячы чалавек» (Звязда, 06.09.2019).

Пры стварэнні тэксту неабходна ўлічваць, што назоўнік пры лічэбніках *паўтара, паўтары* ў назоўным, родным і вінавальным склонах ужываецца ў адзіночным ліку, у давальным, творным і месным склонах прымае форму множнага ліку: «У Івацэвіцкім раёне за двое сутак выпаў 101 міліметр ападкаў. Гэта больш чым *паўтары месячныя нормы*! » (Звязда, 16.08.2019); «Трэба было прайсці праз выпрабаванні па беларускай і рускай мовах, матэматыцы і фізкультуры. Па ёй мы здавалі бег на *паўтара кіламетра*, шэсцьдзесят метраў і падцягванне» (Звязда, 02.09.2019). Лічэбнік жа *паўтараста* спалучаецца з назоўнікамі ў форме множнага ліку: «Раман хоць і заняў ужо *паўтараста вялікіх старонак* дробнага друку, яшчэ толькі-толькі ўвёў нас у самы вузел падзей…» (Маладосць, 14.01.2018). Усе гэтыя адметнасці лічэбнікаў, якія пазначаюць колькасць, што складаецца з цэлага і яго палавіны, маюць вялікае значэнне для перадачы ў тэксце актуальнай інфармацыі больш дакладна, дапамагаюць зацікавіць чытача пазнаёміцца з апісваемымі фактамі.

Такім чынам, можна сказаць, што такая часціна мовы, як лічэбнік, у стылістычных адносінах не вельмі багатая, але шырока праяўляецца ў тэксце вызначэннем факталагічнай і дакументальнай інфарматыўнасці.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Шуба П. П. Лічэбнік // Беларуская мова : Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл. ; пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш]. Мінск : БелЭН, 1994. С. 316–317.

## ТЭМАТЫЧНАЯ ШМАТСТАЙНАСЦЬ ГАЗЕТЫ «МІНСКАЯ ПРАЎДА»

***С. К. Берднік***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220141, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*berdniksiarhej@gmail.com*

Вывучэнне тэматыкі газетных публікацый дазваляе прасачыць, якія напрамкі дзейнасці лічыць рэдакцыя найбольш актуальнымі на сучасным этапе, што імкнецца адлюстраваць у сваіх матэрыялах. Акрамя таго, тэму называе загаловак – адзін з ключавых момантаў, які сведчыць пра ўзровень творчага патэнцыялу аўтара ўжо ў самым пачатку артыкула. Матэрыял можа быць выкарыстаны журналістамі, студэнтамі пры вывучэнні мовы СМІ.

***Ключавыя словы:*** рэдакцыя; газета; артыкул; рубрыка; старонка.